# ПРАБЛЕМА АХОВЫ ПРЫРОДЫ І РАЦЫЯНАЛЬНАГА ПРЫРОДАКАРЫСТАННЯ Ў ПРАЦЫ ТРЭЦЯЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР XI СКЛІКАННЯ (2–3 ЛІПЕНЯ 1985 г.)

*Я.І. Завацкі*

*Ключавыя словы: навакольнае асяроддзе, прыродныя рэсурсы, экалогія, Вярхоўны Савет.*

Этап 1960–1980-х гг. у гісторыі СССР характарызаваўся рэзкім пагаршэннем стану навакольнага асяроддзя, што было звязана з інтэнсіўным развіццём некаторых галін прамысловасці краіны [1, с. 37; 2, с. 4]. Экалагічныя праблемы сталі следствам заганаў камандна-адміністрацыйнай сістэмы, якая існавала за кошт прыродных багаццяў і таннай працоўнай сілы. Ва ўмовах дадзенай сістэмы ажыццяўляўся ведамасны падыход адносна прыродакарыстання, а навуковыя інстанцыі знаходзіліся цалкам у падпарадкаванні міністэрстваў і ведамстваў, выконваючы іх заданні і распараджэнні [3, с. 5].

Працэсы перабудовы, распачатыя ў 1985 г., прымусілі кіраўніцтва СССР перагледзець сваё разуменне глабальных праблем, у тым ліку датычных аховы навакольнага асяроддзя. Даклад М. Гарбачова на красавіцкім Пленуме ЦК КПСС стаў штуршком для разгляду пытання аб захаванні патрабаванняў заканадаўства, якое датычылася аховы навакольнага асяроддзя на трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета СССР XI склікання. 2 ліпеня 1985 г. на сумесным паседжанні абедзвюх палат саюзнага парламента – Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей – з дакладам «Аб захаванні патрабаванняў заканадаўства аб ахове прыроды і рацыянальным прыродакарыстанні» выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР дэпутат З. Нурыеў [4, с. 1, 2].

Прамоўцам было падкрэслена, што плануемы ў будучыні перавод эканомікі на інтэнсіўны шлях развіцця абцяжарваецца сур'ёзнымі недахопамі ў справе беражлівага і эфектыўнага выкарыстання прыродных багаццяў. Шэрагам саюзных міністэрстваў, ведамстваў і Саветаў Міністраў савецкіх рэспублік не заўсёды выконваліся планавыя заданні па ахове прыроды. Перш за ўсё, гэта адносіліся да Міністэрства энергетыкі СССР, Міністэрства чорнай металургіі СССР і Міністэрства хімічнай прамысловасці СССР. Акрамя гэтага, прамоўца звяртаў увагу, што дзеючыя адносіны ў рамках планавай сістэмы гаспадарання не стваралі належнай зацікаўленасці прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у ажыццяўленні прыродаахоўных мерапрыемстваў, комплексным выкарыстанні сыравіны і перапрацоўцы вытворчых адходаў [5, с. 2].

Са сканчэннем выступу З. Нурыева слова для судакладу было прадастаўлена старшыні Камісіі па ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў Савета Саюза дэпутату С. Гросу. Аратар даў

станоўчую ацэнку дакладу намесніка кіраўніка савецкага ўрада і паведаміў дэпутатам, што экалагічныя камісіі палат саюзнага парламента падтрымліваюць высновы і палажэнні гэтага дакумента. С. Гросу дадаў, што прыродаахоўнае заканадаўства рэалізоўвалася ў краіне не поўнасцю. Акрамя гэтага, ён прывёў думку ўзгаданых камісій, якія лічылі неабходным істотна павялічыць тэмпы і аб'ёмы прыродаахоўнага будаўніцтва. Таксама прамоўца выказаўся за неабходнасць стварэння такіх эканамічных рычагоў, санкцый і стымулаў, якія падахвочвалі б міністэрствы і прадпрыемствы з адказнасцю выконваць заканадаўства, палепшылі б іх зацікаўленасць у рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў. Напрыканцы свайго дакладу старшыня Камісіі Савета Саюза паставіў у вядомасць дэпутатам, што тэкст праекта пастановы аб ахове навакольнага асяроддзя з улікам заўваг і прапаноў быў узгоднены з Саветам Міністраў СССР, адпаведнымі міністэрствамі і ведамствамі, грамадскімі арганізацыямі, навуковымі ўстановамі [4, с. 2].

На гэтым сумеснае паседжанне Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР скончылася, і ў той жа дзень пачаліся асобныя паседжанні адзначаных палат парламента, на якіх абмяркоўвалася пытанне аб захаванні патрабаванняў аб ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў [4, с. 2–3]. У прыватнасці, аб комплексе прыродаахоўных захадаў, якія ажыццяўляліся ў БССР на паседжанні Савета Саюза, распавёў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР дэпутат Ю. Хусаінаў. Паводле яго слоў, партыйна-дзяржаўныя органы рэспублікі шырока прыцягвалі грамадскасць да вырашэння прыродаахоўных пытанняў. Пры гэтым асаблівую ролю адыгрывалі пастаянныя камісіі па ахове прыроды Саветаў народных дэпутатаў і Таварыства аховы прыроды, якія налічвалі ў сваіх шэрагах больш за тры мільёны чалавек. Разам гэтыя інстанцыі займаліся экалагічнай адукацыяй і выхаваннем насельніцтва. На той момант у БССР працавала 106 народных універсітэтаў, у якіх пастаянна навучалася больш за 22 тыс. чалавек.

Далей у сваім выступе Ю. Хусаінаў перайшоў да асобных пытанняў, якія мелі дачыненне да эканомікі прыродакарыстання ў рэспубліцы. У цэлым, згодна з ім, больш чым для 80 адсоткаў тэрыторыі БССР былі складзены схемы комплекснага выкарыстання і аховы водных і зямельных рэсурсаў. За апошнія дзесяць гадоў калгасам і саўгасам было вернута звыш 100 тыс. гектараў парушаных прамысловасцю зямель. За той жа адрэзак часу спажыванне свежай вады на адзінку прадукцыі зменшылася ў два разы, а аб'ём другаснага выкарыстання вады ў сістэмах зваротнага водазабеспячэння прамысловасці склаў 83 адсоткі. З усёй колькасці забруджаных сцёкавых вод ачышчалася да патрэбных норм 84,5 адсоткі і часткова – 15,3 адсоткі. Пэўныя станоўчыя поспехі былі дасягнуты і ў ахове атмасфернага паветра. У 1984 г. ад стацыянарных крыніц было ўлоўлена і абясшкоджана больш за 70 адсоткаў аб'ёму шкодных рэчываў.

Тым не менш, як падкрэсліў аратар, у дзейнасці міністэрстваў рэспублікі мелася вельмі шмат недахопаў, аналагічным тым, што прыводзіліся ў

дакладзе З. Нурыева. Пры гэтым Ю. Хусаінаў адзначыў, што без дапамогі шэрагу саюзных міністэрстваў вырашыць асобныя праблемы вельмі складана. Так, у шэрагу гарадоў, такіх як Гомель, Гродна, Магілёў, Мазыр, Навапалацк, Светлагорск, па віне Міністэрства нафтахімічнай прамысловасці, Міністэрства хімічнай прамысловасці, Міністэрства па вытворчасці мінеральных угнаенняў і Галоўнага ўпраўлення мікрабіялагічнай прамысловасці склалася неспрыяльная экалагічная абстаноўка. Акрамя гэтага, вялікую заклапочанасць выклікала сітуацыя на Старобінскім радовішчы калійных соляў, на якім дагэтуль не былі вырашаны пытанні абароны зямель ад забруджвання прыроднага асяроддзя глініста-салевымі шламамі, залішнімі расоламі, затаплення і забалочвання з-за ссядання зямной паверхні. У той жа зоне прыблізна 2 тыс. гектараў зямель выбыла з сельскагаспадарчага звароту, а ў раёне падтаплення апынулася 13 вёсак. Напрыканцы свайго выступу намеснік старшыні беларускага ўраду выказаў меркаванне, што эфектыўнасць прыродаахоўных мерапрыемстваў зніжалася з-за дэцэнтралізацыі экалагічных органаў, таму ён вылучыў ідэю стварэння адзінага дзяржаўнага органа ў гэтай справе [6, с. 2].

3 ліпеня 1985 г. сесія Вярхоўнага Савета СССР працягнула працу на сумесным паседжанні Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей. Тады ж з заключным словам выступіў З. Нурыеў, які заявіў дэпутатам, што, разгледзеўшы пытанне аб ахове прыроды, яны тым самым засведчылі свой вялікі клопат і ўвагу. Пастанова Вярхоўнага Савета СССР «Аб захаванні патрабаванняў заканадаўства аб ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў» была адзінагалосна прынята дэпутатамі [7, с. 1].

У разглядаемай пастанове адзначалася, што руплівае стаўленне да навакольнага асяроддзя не стала абавязковай нормай паводзін кожнага савецкага грамадзяніна, а сістэма дзяржаўнага кіравання і кантролю ў сферы аховы прыроды і рацыянальнага прыродакарыстання ў цэлым мае патрэбу ў далейшым удасканаленні. З гэтай мэтай дакумент прадугледжваў комплекс прыродаахоўных мерапрыемстваў, якія павінны былі ажыццявіць вышэйшыя заканадаўчыя, выканаўчыя і судовыя органы ўлады ў краіне, а таксама грамадскія арганізацыі. У прыватнасці, Савет Міністраў СССР павінен быў распрацаваць доўгатэрміновую Дзяржаўную праграму аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў СССР [8, с. 2–3].

Вынікі працы трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета СССР XI склікання сталі стартавай пляцоўкай па трансфармацыі савецкай экалагічнай палітыкі ў межах гарбачоўскай перабудовы. У будучыні гэтыя рашэнні атрымалі далейшае развіццё ў рамках XXVII і XXVIII з’ездаў КПСС, XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС, XXX і XXXI з’ездаў КПБ, а таксама саюзных і рэспубліканскіх органаў улады. Гэта датычылася рэфармавання экалагічнага заканадаўства і эканамічнага механізму прыродакарыстання, што павінна было выразіцца ў дэцэнтралізацыі саюзнага кіравання, перадачы паўнамоцтваў па лакальным распараджэнні прыроднымі рэсурсамі саюзным рэспублікам і

Саветам усіх узроўняў, пераходзе ад фактычна ведамаснага валодання прыроднымі рэсурсамі да агульнанароднага ў асобе мясцовых органаў улады, якія павінны былі несці поўную адказнасць за стан экасістэмы. Аднак распад Савецкага Саюза ў 1991 г. пераклаў экалагічныя праблемы Беларусі цалкам на яе плечы.

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Макеева, Е.Д. Природоохранная политика СССР в 1960–1980-х гг.: успехи, провалы и противоречия / Е.Д. Макеева. // История и археология: материалы IV Междунар. науч. конф. (г. Санкт-Петербург, июль 2017 г.). – Санкт-Петербург: Свое издательство, 2017. – С. 37–41.
2. Артемов, Н.Н. Исторический опыт государственной политики СССР в сфере природопользования и охраны окружающей среды в 1960–1980-е гг.: дис. ...канд. ист. наук: 07.00.02 / Н.Н. Артемов. – Москва: МПГИ, 2005. – 193 с.
3. Пиджаков, А.Ю. Советская экологическая политика 1970-х – начала 1990-х годов / А.Ю. Пиджаков. – Санкт-Петербург: СПбУЭФ, 1994. – 160 с.
4. Курсом мира и созидания: третья сессия Верховного Совета СССР одиннадцатого созыва // Советская Белоруссия. – 1985. – 3июля. – С. 1–3.
5. О соблюдении требований законодательства об охране природы и рациональном использовании природных ресурсов: доклад заместителя Председателя Совета Министров ССР депутата З.Н. Нуриева // Советская Белоруссия. – 1985. – 3 июля. – С. 2.
6. Прения по докладу заместителя Председателя Совета Министров СССР депутата З.Н. Нуриева: речь депутата Хусаинова Ю.М. // Советская Белоруссия. – 1985. – 4 июля. – С. 2.
7. Укрепляя порядок и организованность: третья сессия Верховного Совета одиннадцатого созыва // Советская Белоруссия. – 1985. – 4 июля. – С. 1, 3.
8. О соблюдении требований законодательства об охране природы и рациональном использовании природных ресурсов: постановление Верховного Совета СССР // Советская Белоруссия. – 1985. – 4 июля. – С. 2–3.


## СТАНОВЛЕНИЕ И КОНСТИТУЦИОННОЕ ЗАКРЕПЛЕНИЕ НОВЫХ КОНСТИТУЦИОННЫХ ИНСТИТУТОВ В ПОСТСОВЕТСКИХ СТРАНАХ В 1990-е ГОДЫ


*Е.Ф. Ивашкевич*



*Ключевые слова: институт президентства, бикамерализм, конституционные основы судебной власти, институт конституционного контроля.*


Еще до распада СССР во многих странах оформлялся институт президентства. В Украинской ССР он был введен Законом от 06.07.1991 «Об учреждении поста Президента Украинской ССР и внесении изменений